Асоба

З пакалення, апаленага Вайной

(Ветэрану Вялікай Айчыннай Вайны Анатолю Філімонаву — 80 гадоў)



17-гадовым юнаком ён сустрэў Вялікую Айчынную вайну. Яна перакрэсліла ўсе юнацкія мары і надзеі. Пачаўся доўгі ваенны шлях: 1-я партызанская брыгада імя К. Заслонава, а пазней—1-ы Прыбалтыйскі фронт, недзе пад Варшавай раненне.

Напэўна, у нейкай ступені ўсё перажытае і ўбачанае, увесь трагізм ваенных гадоў аказалі свой уплыў на выбраную пасля вайны прафесію. І ён выбраў яе, бадай, адну з самых мірных і высакародных—прафесію бібліятэкара.

У 1950 годзе Анатоль Ільіч Філімонаў пасля заканчэння бібліятэчнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута прыязджае на работу ў Віцебскую абласную бібліятэку імя У. І. Леніна. Спачатку ён працуе на пасадзе загадчыка навукова-метадычнага аддзела, потым—намеснікам дырэктара. На гэтых пасадах ён меў магчымасць у поўнай меры рэалізаваць свой прафесійны і творчы патэнцыял.

Пасляваенная Віцебшчына з разбуранай гаспадаркай, са знішчанымі і разрабаванымі культурнымі каштоўнасцямі. Колькі трэба было прыкласці намаганняў, каб пачаць ствараць усё занава. Ва ўсёй аднаўленчай працы па развіццю сеткі бібліятэк вобласці, станаўленню бібліятэчнай справы ёсць вялікая заслуга асабіста Анатоля Ільіча Філімонава. У любое надвор'е, па бездарожжы, дзе пехатой, дзе на спадарожных машынах яму даводзілася дабірацца да самых аддаленых раёнаў і вёсак вобласці, каб сваім аўтарытэтам, сваімі парадамі аказаць дапамогу ў арганізацыі работы бібліятэк. Надавалася ўвага і абучэнню бібліятэчных кадраў, правядзенню абласных семінараў. Усяму гэтаму ён аддаваў свае сілы, веды і сваё майстэрства.

У 1971 годзе Анатоль Ільіч узначальвае тады яшчэ зусім маладую абласную дзіцячую бібліятэку імя Н. К. Крупскай. Работа на гэтай пасадзе пачалася ў нейкай ступені сімвалічна—з вялікага капітальнага рамонту. Пад яго кіраўніцтвам у бібліятэцы быў сабраны дзейсны творчы калектыў са сваім асаблівым прафесійным і псіхалагічным станам, дзякуючы чаму абласная дзіцячая бібліятэка стала сапраўдным метадычным цэнтрам па арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання дзяцей і падлеткаў з улікам патрабаванняў часу. Бібліятэкай выдаваліся метадычна-бібліяграфічныя матэрыялы ў дапамогу арганізацыі работы дзіцячых бібліятэк, якія атрымлівалі высокія адзнакі на рэспубліканскім узроўні, яна брала ўдзел у навуковых даследаваннях, праводзімых Нацыянальнай бібліятэкай.

Пры дзейснай метадычнай і практычнай дапамозе асабіста Анатоля Ільіча і калектыва бібліятэкі ў дзіцячых бібліятэках вобласці паспяхова прайшоў працэс цэнтралізацыі.

Але ж, калі гаварыць пра асобу Анатоля Ільіча Філімонава, то нельга абысціся толькі яго паслуговым спісам, пералікам зробленага. Ёсць у ім якасці, вельмі вызначальныя для чалавечай асобы, можа нават рэдкія. Анатоль Ільіч—сапраўдны беларускі інтэлігент з добрым веданнем сваёй гісторыі, цудоўнай беларускай мовы. І, наколькі гэта было магчыма, ён нёс гэта людзям. Пад яго асабістай апекай адбывалася ў свой час стварэнне ў абласной бібліятэцы аддзела беларускай і краязнаўчай літаратуры—аддзела, які сёння мае багаты фонд літаратуры і карыстаецца павагай сярод чытачоў.

І яшчэ вельмі важная адметнасць. Акрамя высокага прафесіяналізму, эрудыцыі, Анатоля Ільіча вызначалі добразычлівыя, паважлівыя і далікатныя адносіны да сваіх калег, наогул, да людзей. Яго ўнутраная культура і выхаванасць не дазвалялі зняважлівых і абыякавых адносін да тых, з кім даводзілася працаваць, усталёўваць дзелавыя зносіны. Гэта прыклад кіраўніка, які многа зрабіў не толькі на бібліятэчнай ніве, але і для канкрэтных людзей.

Амаль 40 гадоў аддаў Анатоль Ільіч Філімонаў служэнню бібліятэчнай справе. Зярняты, якія былі пасаджаны ім, садзейнічалі стварэнню ў Віцебскай вобласці сеткі бібліятэк, іх паступальнаму і стваральнаму развіццю. А тыя, каму пашчасціла працаваць поруч з ім, з цеплынёй і ўдзячнасцю ўспамінаюць аб гадах суменсная работы.

Шаноўны Анатоль Ільіч! 22 чэрвеня Вы адзначылі свой 80-гадовы юбілей. Вашы калегі віншуюць Вас з асабістым юбілеем, з 60-годдзем вызвалення Беларусі. Мы жадаем Вам—Бібліятэкару, Ветэрану, Чалавеку доўгіх гадоў жыцця, аптымізму і дабрабыту.

Святлана КАРЖЫЦКАЯ,
загадчыца аддзела бібліямаркетынгу
ЦГБ імя М. Горкага.